УДК: 61:615.1(043.2)
ББК: 5:52.8
ISBN: 978-985-21-0532-3



***Валанцэвіч У.І., Платонава В.У.***

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў ПАЎСЯДЗЁННЫМ ЖЫЦЦІ І Ў МЕДЫЦЫНСКАЙ СФЕРЫ**

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Носік А.А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г.Мінск*

Вакол кожнага з нас штодзённа “круцяцца” мільярды слоў: музыка, рэклама, тэлебачанне, простая гутарка з сябрам або кансультацыя з лекарам. Але колькі з іх мы пачуем ці ўбачым на роднай мове?

Моўнае пытанне ў нашай дзяржаве закранае ўсе сферы. Не выключэннем з’яўляецца і медыцына. У цяперашні час вельмі рэдка сустрэнеш урача або фармацэўта, які змог бы правесці дасканалую кансультацыю на беларускай мове. І вельмі сумна ўсведамляць, што пры падрыхтоўцы спецыялістаў прыярытэтнай з’яўляецца замежная мова, а не родная. “Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але наперш трэба знаць сваю” (Ф.Багушэвіч).

“Кожны народ мае свой гонар. Англічанін перад усім светам горда вызначае: я – англічанін! Тое самае скажа француз, немец, аўстрыец, рускі і іншыя прадстаўнікі розных нацый. А мы, беларусы, не адважваемся прызнацца ў тым, што мы – беларусы. Бо на галаву беларускага народа, як вядома, многа выліта памыяў, годнасць яго прыніжана і мова яго асмеяна, у яго няма імя, няма твару” (Я.Колас). Шмат праўдзівага змяшчае гэта выказванне, таму што на сённяшні дзень родная мова для значнай часткі сучасных беларусаў, на вялікі жаль, амаль нічога не значыць.

Як людзі адрэагуюць на зварот да сябе на беларускай мове? Колькі з іх змогуць адказаць па-беларуску? Колькі людзей слухаюць песні на беларускай мове? Мы паспрабуем даць адказы на гэтыя актуальныя пытанні ў дадзенай навуковай рабоце.

Репозиторий БГМУ